ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення адукацыі
Карэліцкага райвыканкама,
старшыня арганізацыйнага
камітэту
______________ І.В.Асташэвіч
“ “ кастрычніка 2020 г.

**Заданні школьнага этапу рэспубліканскай алімпіяды**
**па беларускай мове і літаратуры 2020/2021 навучальны год**
**Комплексная работа**

**9 клас**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

1. **Устаўце прапушчаныя літары. Растлумачце лексічнае значэнне падкрэсленых слоў.**

Калінкаві..кі, экстр..мальны, ра..яўлены, у..чуваць, бул..н, ст..мільённы, д..піляцыя, аген..тва, пакга..з, панц..р, па..вердзіць, тры..мвірат, філасо..скі, д..летант, ц..люлоза, а..хон.

**2. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.**

| У рускай мове | | У беларускай мове |
|---|---|---|
| 1. | Широкий простор | |
| 2. | Стеклянная банка | |
| 3. | Чистый пол | |
| 4. | Горячий источник | |
| 5. | Старинная летопись | |
| 6. | Денежная прибыль | |
| 7. Подавляющее большинство | | |
| 8. | Очередная перепись | |

**3. Закончыце фармулёўку:**

1. Устарэлыя назвы прадметаў і з’яў рэчаіснасці называюцца - … .
2. Якім словам-сінонімам можна замяніць лексему РАРЫТЭТ? …

3. Якім словам-амонімам можна назваць : а) знак у пачатку нотнага радка, які вызначае вышыню нот б) металічную прыладу для адмыкання і замыкання замка? …
4. Як называецца празрыстая смала, якая выступае на ствалах дрэў у месцах іх пашкоджання? …
5. Як называецца раздзел мовазнаўства, які вывучае тэарэтычныя асновы і практыку складання слоўнікаў? …
6. Як называюцца слоўнікі, у якіх раскрываецца паходжанне слоў, выяўляюцца элементы яго значэння ў мінулым? …

**4. Устаўце ў сказы прапушчаныя фразеалагізмы з кампанентамі-лічэбнікамі ў адпаведнасці з пазначанымі лексічнымі значэннямі.**

| **Сказ** | **Значэнне фразеалагізма** |
|---|---|
| 1. Дзянёк быў сонечны, і апранутая ў цёплы кажух Маечка была ______________________________ ад радасці *(У. Краўчанка)* | "(быць) бязмерна шчаслівым, вельмі задаволеным" |
| 2. Герасім у той час у размове з любой дзяўчынай не мог ________________________________, заікаўся, бляднеў і пацеў*(І. Шамякін).* | "(не магчы) звязна выказаць свае думкі" |
| 3.– А я дзень пры дні сяджу ________________________________ і свету белага не бачу, - звычайна скардзіўся Пцічкін (І. Новікаў). | "не выходзячы з дому, з памяшкання" |

**5. Аб'яднайце словы ў тры групы, каб яны былі аднолькавымі з граматычнага пункту погляду.**

Акуляры, браткі, лістота, блізняты, брусніцы, смех, вароты, вейкі, завушніцы, нагавіцы, хлуд, шэпт.

6. **Прасачыце гісторыю ўтварэння назваў свят і прысвяткаў беларускага народнага календара.**

| **Назва** | **Утваральная аснова** | **Спосаб словаўтварэння** |
|---|---|---|
| ***Узор:*** ***5.05. – Ляльнік*** | ***Лял(я)+нік([] )*** | ***суфіксальны*** |
| 14.01 –Васілле | | |
| 6.04 – Камаедзіца | | |
| 4.06 – Абліваха | | |
| 14.08 – Макавей | | |
| 12.11- Пpаллі | | |

**7. Прачытайце тэкст. Утварыце і запішыце колькасна-іменныя спалучэнні.**

Беларускі мастак Аляксандр Кішчанка занесены ў кнігу рэкордаў Гінэса як аўтар самага вялікага габелена ў свеце. Маштабнасць яго твора сапраўды ўражвае: гэта палатно 14х19 м , вагой пад 300 кг, агульная даўжыня ніткі – 806 км. Габелен ткаўся ўручную 4 (год). На ім адлюстравана больш за 80 вядомых (асоба).

| Лік | Колькасна-іменнае спалучэнне |
|---|---|
| 14х19 м | |
| 300 кг | |
| 806 км | |
| 4 (год) | |
| 80 (асоба) | |

**8. Запоўніце табліцу.**

| Герой (героі) | Назва твора | Жанр твора | Аўтар |
|---|---|---|---|
| Ганна, Мульцік, Гастрыт | | | |
| Сцяпан, Вера, Ніна, Коля, цётка Ганна, Лёнік | | | |
| Сцяпан Крыніцкі, Адольф Быкоўскі, Паўлінка | | | |
| Карпенка, Глечык, Фішар, Свіст | | | |
| Машэка, Наталька | | | |

**9. З пералічаных жанраў лірычных твораў выбраць нумары правільных адказаў.**

| А. Філасофска-медытацыйныя | | Б. Велічальна-хвалебныя | |
|---|---|---|---|
| 1. | Стансы | 1. | Дыфірамб |
| 2. | Медытацыі | 2. | Элегія |
| 3. | Ода | 3. | Баркарола |
| 4. | Пасланне | 4. | Мадрыгал |
| 5. | Серэнада | 5. | Эпітафія |
| 6. | Пародыя | 6. | Эпіграма |

**10. Пазнай рэч па апісанні.**

1. Герой вядомай аповесці В. Быкава быў вельмі сквапны. Ён не хацеў дзяліцца са сваімі таварышамі-байцамі тым, пра што ідзе гаворка. Адзін з байцоў усё ж употайкі ўзяў гэты прадмет і падзяліў яго паміж усімі, тым самым заставіўшы чытачоў задумацца: ці правільна ён зрабіў, узяўшы чужую рэч?
2. У аповесці Змітрака Бядулі "На Каляды к сыну" Тэкля пайшла ў горад, каб наведаць свайго адзінага сына Лаўручка. Успомніце, як сустрэў яе сын. Што ўторкнуў ёй лёкай у скручаныя ад холаду пальцы?
3. Атрымаўшы доўгачаканы падарунак, герой апавядання Міколы Лупсякова "Мэры Кэт" адчуваў сябе менавіта так: *"У мяне балелі і бакі, і спіна, і ногі. А тут яшчэ я некалькі разоў выцяўся і каленкамі, і бокам. Ішоў дадому і думаў, што я самы нешчаслівы на свеце чалавек. Дома, павячэраўшы, адразу ўпаў на ложак і заснуў як забіты."* Што ж падарыў Антону бацька?